# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ЦУДАДЗЕЙНАЙ ІКОНЫ «БОЖАЯ МАЦІ ПАДЛЕСКАЯ»

*Булаты П.Ю.*
*(Мінск, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы)*

У праваслаўнай традыцыі ікона займае выключнае месца. Царкоўная іканапісная традыцыя – спосаб выяўляць на роўнядзі не двухмерныя і нават не трохмерныя з’явы свету, а шматмерныя альбо бязмерныя з’явы іншага свету. Ікона, як абраз святы, з’яўляецца адной з праяў царкоўнага Падання, зароўна з Паданнем запісаным і Паданнем вусным. Ушанаванне ікон Збавіцеля, Божай Маці, Анёлаў і святых – догмат хрысціянскай веры, сфармуляваны Сёмым Сусветным Саборам. Гэты догмат выцякае з асноўнага вызнання Царквы – ачалавечвання Божага Сына. Яго абраз з’яўляецца сведчаннем праўдзівага, а не зданнёвага Яго ўвасаблення. Таму іконы справядліва называюць «багаслоўем у фарбах», аб чым Царква штораз нагадвае ў сваім служэнні [1]. Вывучэнне зместу і сэнсу ікон, сімвалізму, іх паходжання і гістарыяграфіі – прадмет багаслоўскі і досыць важны ў царкоўным жыцці.

Сярод шматлікіх хрысціянскіх абразоў вылучаецца група тых, якія маюць статус цудадзейных. Пад цудадзейным абразом у Праваслаўнай царкве разумеецца іканапісная выява, якая ўшаноўваецца як крыніца цудадзействаў разнастайнага кшталту: вылячэння, дапамогі на вайне, пры пажары. Крыніцай цудоўных дзействаў, на думку Царквы, з’яўляецца міласць Божая, якая дзейнічае праз ікону. У Праваслаўнай царкве ўшаноўваецца каля 1000 абразоў, якія праславіліся сваімі цудамі. Як правіла, гэта іконы Божай Маці.У цудзе, па словах багаслова Л.А. Успенскага, пера-



**Малюнак 1.**
Цудадзейны абраз
«Маці Божая Падлеская»

магаецца чын натуральнага, усталяваны Богам парадак Ім жа парушаецца дзеля выратавання чалавека. Бог можа тварыць цуды і апроч ікон, так як Ён і «нявартым дзейнічае»і творыць цуды і сіламі прыроды. З гэтай прычыны цудадзеянне іконы разумеецца як яе знешняе і часовае праяўленне [1]. Абгрунтаваннем для ўшанавання таго ці іншага абраза цудадзейным з'яўляецца засведчанне духоўнымі ўладамі выпадкаў цудоўнай дапамогі праз малітвы перад іконаю.

Гісторыя усходнеславянскіх цудадзейных ікон усходзіць да першых стагоддзяў пасля прыняцця хрышчэння. Шмат абразоў, якія ўшаноўваюцца як цудадзейныя, вядома на землях Беларусі. Адным з іх з'яўляецца прадстаўлены на малюнку 1 цудадзейны абраз Маці Божай Падлескай, гістарыяграфію якой разгледзім далей.

Цудадзейная ікона «Маці Божая Падлеская» знаходзіцца ў Свята-Духавай царкве ў вёсцы Вялікае Падлессе (Ляхавіцкі раён, Брэсцкая вобласць), у Пінскай і Лунінецкай епархіі. Як правіла, вынахаджэнне цудадзейных абразоў звязваецца з надзвычайнымі трансцэндэнтнымі падзеямі, якія трансліруюцца ў форме народнай легенды. Кан-

тэкст паданняў звычайна наступны: у пэўным месцы (адкрыты прастор: поле, лес, пры дарозе) з’яўляецца абраз хворым людзям, якія атрымліваюць аздараўленне, а пасля абраз становіцца шанаваным у гэтай мясцовасці. Падобная ж легенда звязаная і са з’яўленнем Падлескай іконы. Апублікаваныя ў гістарычна-статыстычным апісанні Мінскай епархіі за 1868 г. звесткі паведамляюць, што «по местномупреданиюонаявилась на камнеподлекреста, стоявшегоблиздорогииз села Подлесья в деревнюЗаритов, некоторойпроходившейздесь и прозревшейслепорожденнойдевице[2]». Адзначаецца, што па стане на 1864 г. пісьмовых звестак адносна цудаў ад іконы не захавалася, але пазначана, што ў гонар іконы быў складзены гімн на польскай мове невядомым аўтарам [2].

З мастацкай кропкі погляду дадзены абраз вызначаецца як выкананы ў тэхніцы тэмпера на дубовай дошцы з залатым фонам і памерам 107х93 см. Абраз агорнуты ў залачоную шату (аклад немаўляткі Ісуса срэбны) з залачонымі каронамі. Датуецца XVII стагоддзем[3]. Іканапіс і сакральны жывапіс Беларусі гэтага перыяду, па словах мастацтвазнаўцы Н. Высоцкай, уяўляе сабою арыгінальную з’яву еўрапейскай культуры. Ён развіваўся адначасова з манументальным і свецкім мастацтвам і захаваў дзве магутныя галіны еўрапейскай культуры: іканапіс і алтарны жывапіс, якія існавалі ва ўзаемаўплыве і ўзаемаўзбагачэнні, што не мае прамых аналогій у мастацтве Заходняй і Усходняй Еўропы і караніцца ў гістарычных асаблівасцях развіцця Беларусі, размешчанай на стыку лацінскага захаду і праваслаўнага ўсходу, што ў сваю чаргу спрыяла ўзнікненню цесных сувязей мастацтва як з візантыйскай, так і з заходнееўрапейскай

культурай. У агульным ходзе фарміраванні беларускай народнасці, мовы, культуры ў XIV–XVI ст. адбываўся працэс станаўлення мясцовай школы жывапісу, што адыграла вызначальную ролю ў развіцці мастацтва наступных стагоддзяў. Так, у Беларусі склалася ўнікальная сітуацыя, пры якой адбылося арганічнае спалучэнне еўрапейскай стылістыкі, якая паслядоўна развівалася, з візантыйскімі вытокамі, мясцовымі традыцыямі, што спрыяла сцвярджэнню паўночнаітальянскага варыянта барока, які ў далейшым выліўся ў фарміраванне ўласнай нацыянальнай школы ў архітэктуры і іншых відах мастацтва [4].Як адзначаюць мастацтвазнаўцы Эльза Максіма і ВольгаЦерашчатава, абраз Божай Маці Падлескай (як і іншыя іконы з Падлесся таго перыяду) надзвычай самабытны і выкананы на высокім прафесійным узроўні. Прычым манера выканання вельмі адрозніваецца ад паўднёвапалескай. Гэта дае падставы меркаваць, што недзе ў наваколлі, а магчыма ў саміх Ляхавічах (як цэнтры буйнога маёнтка, які належаў прадстаўнікам магнатэрыі ВКЛ), існавала мастацкая іканапісная майстэрня [3].

Праліць свет на некаторыя аспекты з гісторыі іконы дапамагае корпус гістарычных крыніц –акты візітацый уніяцкіх парафійXVII–XIXст., якія не так даўно ўвайшлі ў шырокі навуковы ўжытак.Акты царкоўных візітацый з'яўляюцца вялікім і важным пластам крыніц выключнай інфарматыўнасці па канфесіянальнай (і не толькі) гісторыі. Дадзены від гістарычных крыніц хоць і прысутнічае ў даследчых працах рознага накірунку, аднак агульнае выкарыстанне візітаў цэркваў можна ахарактарызаваць як фрагментарнае і досыць сціплае. Сам працэс візітацыі вызначаецца як перыядычнае абследаванне іерархамі падуладных епархій,

прыходаў, кляштараў. Візітацыі былі пашыранай формай пастырскай апекі і царкоўна-адміністрацыйнага кантролю за дзейнасцю парафіяльнага святарства. Візітацыі ладзіліся епіскапамі або іх архідыяканамі з пэўнай перыядычнасцю і ахоплівалі духавенства, вернікаў, цэрквы з іх фундушамі і маёнткамі, брацтвы, шпіталі, манаскія абшчыны. Падчас правядзення візітацыі для апісання парафій складалася візітацыйная дакументацыя па вызначанаму фармуляру. У ім змяшчаліся пытанні, якія павінны былі задавацца візітатарамі[5].

Аднак спачатку, дзеля разумення пэўных момантаў, коратка акрэслім гістарычныя этапы развіцця парафіі ў в. Падлессе. Свята-Духаў прыход у в. Падлессе ўзнік прыкладна ў апошняй трэці XVIII ст. на месцы капліцы [6], узведзенай прыкладна ў сярэдзіне таго ж стагоддзя. Першапачаткова царква насіла тытул Святой Тройцы і Святых Апосталаў Пятра і Паўла і з’яўлялася філіяльнай царквой Ляхавіцкай Свята-Георгіеўскай царквы[7]. У сувяззю з даўнасцю і кепскім станам у 1784 г. Ляхавіцкая царква была зачыненая і цэнтр парафіі і ўсё царкоўнае начыненне былі перанесены ў вёску Падлессе [7]. Па звестках 1819 г. у Ляхавічах планавалася ўзвесці новую царкву, але планы засталіся не здзейсненымі і цэнтр парафіі застаўся ў Падлессі надалей [8].Такім чынам, усё царкоўнае начыненне, у тым ліку і іканапіснае, са старажытнага і досыць заможнага Ляхавіцкага прыходу апынулася ў Падлессі, дзе фрагментарна захоўваецца і да нашага часу.

Адпаведна, цудадзейны абраз, які сёння вядомы як «Маці Божая Падлеская», першапачаткова знаходзіўся ў Ляхавіцкай царкве. Аб гэтым сведчыць акт візітацыі 1680 г. Адзначаецца, што ў царкве знаходзіцца абраз Божай Маці.

Хоць у дакуменце не прыводзіцца яго знешняга апісання, аднак пазначаецца, што ікона пры сабе ўтрымлівае вялікі шэраг вотаў, што дае падставы сцвярджаць аб шанаванні абраза.Сярод ахвяраванняў на іконе адзначаюцца: тры вялікія срэбныя таблiцы, тры ручкі, два паўмесяцы, тры сэрца, дваццаць малых таблічак, пяць срэбных крыжыкаў, два срэбных кулоны апраўленых у крышталь і адзін бурштынавы ў срэбнай аправе, двое караляў (адны з перлін), маленькая срэбная зорка, пакрыты срэбрам пасак, тасьма залатая [9].

Наступныя звесткі, што датычацца іконы, адносяцца да акту візітацыі 1753 г. У дакуменце наўпрост пазначаецца, што абраз Божай Маці праслаўлены сваімі цудамі. У царкве ікона змяшчалася ў асобным алтары рамеснай працы. На іконе змяшчалася дзве срэбныя кароны, два срэбныя паўмесяцы. Прысутнічалі шматлікія воты: таблічкі, ручкі, медальёны, крыжыкі, ланцужкі, каралі. Завешваўся абраз блакітнымі фіранкамі[6].

У акце візітацыі 1793 г. таксама сустракаюцца звесткі датычныя іконы. Як казалася вышэй, на той час цэнтр парафіі змяшчаўся ўжо у Падлескай царкве. Цудадзейны абраз у срэбнай шаце знаходзіўся ў галоўным алтары сніцарскай працы. Былі на іконе дзве срэбныя кароны, 14 пазалочаных таблічак і шэраг іншых шматлікіх вотыевых прадметаў [7].

Досыць сціплыя і лаканічныя звесткі пра ікону сустракаюцца і ў візіце 1819 года [8].

Больш падрабязнае апісанне іконы сустракаецца ўжо ў гісторыка-статыстычным апісанні Мінскай епархіі за 1879 г. Адзначаецца, што абраз, пісаны на дубовай дошцы, у візантыйскім стылі па залатым грунце, знаходзіцца ў

драўлянай залачонай раме. Маецца пры ім шата са срэбра нізкай пробы, з дзвюма такімі ж вянцамі. У тым жа дакуменце прыводзіцца і акрэсленая вышэй легенда з'яўлення іконы [10].

Цудадзейны абраз «Маці Божая Падлеская» за-хоўваецца ў царкве і сёння. Ікона з'яўляецца вельмі шанаванаю сярод прыхаджан храма.

Такім чынам, разгледзеўшы гістарыяграфію цудадзейнага абраза, можна адзначыць наступнае:

1) З'яўленне цудадзейных абразоў, як правіла, звязваецца з надзвычайнымі з'явамі, якія набываюць форму народнага падання і часта падмяняюць гістарычную рэчаіснасць;

2) Значным корпусам крыніц, дзе адлюстроўваецца гістарыяграфія абразоў, з'яўляюцца акты царкоўных візітацый;

3) Звесткі, выяўленыя ў дакументальных гістарычных крыніцах, дазваляюць сцвярджаць аб трывалых і старадаўніх традыцыях шанавання абраза;

4) На падставе дакументальных апісанняў можна прасачыць дынаміку мастацкага абрамлення іконы, а менавіта – змяненне складу вотыевых рэчаў.

Усё гэта падкрэслівае значнасць і актуальнасць даследаванняў, звязаных з дакументальнай гістарыяграфіяй цудадзейных абразоў.

## КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА

1. Успенский, Л.А. Богословие иконы Православной Церкви. / Л.А. Успенский. – Переславль : Издательство братства во имя святого князя Александра Невского, 1997.

2. Архимандрит Николай. Историко-статистическое описание церквей Минской епархии. – Санкт-Петербург, 1864.

3. Максімава, Э., Церашчатава, В. Трысвяціцелі, палескі вадзянік і залатыя лісты аканта / Эльза Максімава, ВольгаЦерашчатава // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Ляхавіцкага раёна – Мн. : БелСавЭн, 1989. – С.100–107.

4. Высоцкая, Н.Ф. Уводзіны / Н.Ф. Высоцкая // Іканапіс і алтарны жывапіс Беларусі XII–XVIII стагоддзяў. – Мінск : "Беларусь", 2012. – 231 с.

5. Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя. Т.3. Дадатак. А – Я / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – 696 с.

6. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Фонд 823. – Воп. 3. – Спр. 604.

7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 41248.

8. НГАБ. Фонд 136. – Воп. 1. – Спр.41258.

9. Візіты уніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага сабораў 1680–1682 гг.: Зб. дак-таў / Склад. Д.В. Лісейчыкаў. – Мінск : І.П. Логвінаў, 2009.

10. Описание церквей и приходов Минской епархии 1878/79 гг. – Минск, 1879.